# Андрэй Макаёнак:
## чалавек і майстар падтэксту
## (да 105-годдзя народнага пісьменніка)



***«Дыхай сёння. Дыхай кожны дзень. Тое, што не ўдыхнеш сёння, заўтра не кампенсуеш».***
*Андрэй Макаёнак*
*«Зацюканы апостал», 1970*

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, 2025



***«Хоць і горкі хлеб камедыёграфа-сатырыка, але... Трэба ж некаму і сатырай займацца».***
*Андрэй Макаёнак*
*«Аўтабіяграфія»*
*1977*



Індывідуальнае фота
А.Я.Макаёнка. 1956
*Фонд 169, Воп. 1, Спр. 18, арк. 1*

**Андрэй Ягоравіч Макаёнак** (1920 – 1982) – вельмі незвычайная асоба ў гісторыі беларускай савецкай літаратуры і драматургіі. Ён быў народным пісьменнікам, якога любілі не столькі чытачы, колькі гледачы. Ён ставіў у тупік нават самых вытанчаных крытыкаў. Яго п'есы, поўныя народнага гумару, былі глыбейшымі і разумнейшымі за тое, што дазвалялася ў яго эпоху. Андрэй Макаёнак – сапраўдны майстар мастацкага падтэксту, аўтар незвычайных ідэй і сітуацый, які ўмеў паказаць адначасова хітрасплятанні кахання, абсурд бюракратыі, вечную драму бацькоў і дзяцей, і ўсё гэта – на фоне калгаснага поля.

А.Я.Макаёнак нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў вёсцы Борхаў, што да 1926 г. уваходзіла ў склад Гомельскай губерніі РСФСР. Яго разнабаковы талент выявіўся ўжо ў дзяцінстве. Ён маляваў, выразаў з дрэва, быў цудоўным апавядальнікам, удзельнічаў у школьнай самадзейнасці. У 1939 – 1942 гг. служыў у Чырвонай арміі. Быў цяжка паранены і ледзь не страціў абедзьве нагі. У 1947 – 1953 гг. ён працаваў у часопісе "Вожык". У 1966 – 1977 гг. узначальваў рэдакцыю часопіса "Нёман". Як грамадскі дзеяч удзельнічаў у працы беларускай дэлегацыі ў ААН, выконваў абавязкі дэпутата Вярхоўнага Савета БССР. Але ўсё ж такі галоўным напрамкам яго жыцця заставалася менавіта творчая дзейнасць.



У Саюзе пісьменнікаў, 1956.
Верхні шэраг: Андрэй Макаёнак і Антон Бялевіч. Ніжні шэраг: Пімен Панчанка і Янка Брыль
*Фонд 169, Воп. 1, Спр. 18, арк. 2*

Першы апублікаваны твор А.Я.Макаёнка, п’еса “Дабра, калі дабра канчаецца”, з’явіўся ў газеце “Чырвоная змена” у 1946 г. Сапраўдную славу яму прынесла сатырычная камедыя “Выбачайце, калі ласка”, пастаўленая на тэатральнай сцэне ў 1954 г., усяго праз год пасля смерці І.В.Сталіна. Фармальна яна высмейвала хібы савецкай бюракратыі, але ў рэчаіснасці ў ёй крытыкавалася створаная ў выніку калектывізацыі жорсткая сістэма, калі сяляне-калгаснікі дашчэнту абіраліся дзяржавай. Пасля паспяховага паказу п’есы ў Маскве малады драматург стаў знакамітым.

У далейшым вялікі поспех атрымалі яго творы “Дыхайце эканомна”, “Зацюканы апостал”, “Лявоніха на арбіце”, “Трыбунал”, “Таблетку пад язык”, “Святая прастата”, “Пагарэльцы” і інш. Яны ставіліся на тэатральнай сцэне, гучалі як радыёспектаклі, на іх аснове пісаліся сцэнары для кіно. Кожная п’еса А.Я.Макаёнка ператваралася ў сапраўдную падзею. У сваёй творчасці ён па-мастацку спалучаў камедыю з вострай сацыяльнай драмай і трагедыцяй, ствараў незвычайныя жыццёвыя сітуацыі, рабіў сваімі героямі простых, але вельмі глыбокіх людзей. Дзякуючы гэтаму ён раскрываў перад чытачом і гледачом тое, на што іншыя аўтары ніколі не адважваліся, вёў у свет то няспраўджаных мар, то – яскравага трапнага гумару, вымушаў шчыра суперажываць сваім героям.



Андрэй Макаёнак чытае п'есу. Фатаздымкі для публікацыі ў газеце «Літаратура і мастацтва».
*Фонд 438, Воп. 1, Спр. 13, арк. 5 - 9*

Архіўная спадчына А.Я.Макаёнка даволі раздраблёная. У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваецца фонд 438 “Збор дакументаў Макаёнка Андрэя Ягоравіча”. У ім усяго 14 спраў (78 дакументаў), якія паступілі з розных крыніц да 2002 г. Аднак дакументы, звязаныя з яго імем, таксама ўтрымоўваюцца ў іншых фондах, што з’яўляецца найлепшым сведчаннем шырокай сацыяльнай камунікацыі і добрай памяці, якую заставіў пасля сябе гэты вельмі таленавіты чалавек.

*Дзмітрый Самахвалаў*
*кандыдат гістарычных навук*
*вядучы навуковы супрацоўнік аддзела*
*інфармацыі, публікацыі*
*і выкарыстання дакументаў БДАМЛМ*

Андрэй Макаёнак, трагікамедыя «Дыхайце эканомна». Машынапіс з аўтарскай праўкай. 1982

*Фонд 438, Воп. 1, Спр. 2, арк. 10зв - 11*

③ Занять все. Девочки и все идут вперед с кружками

② Адольф дает сигнал на муз: „Маэстро"я

мужчины в оркестровке



дней моих мне будет мерещиться, мне будет слышиться... Я уже этим наказан. Я же исполнил волю Тайной Думы.

Многие в испуге ахнули, притаились, ждут.

Ф а р и д. Это кощунство! Катить бочку на Тайную Думу.

И с а а к. Это святотатство! Это — непростительно! Катить бочку на Тайную Думу

Л ю д о в и к. Жалости не жди!

бегает по кругу

А д о л ь ф. Никакой жалости! Этот хлюпик не достоин нашего общества! Мы будем беспощадны! Нам он уже не по пути! Долой его! Разве можно доверять ему власть? Нет!

И с а а к. Но и без власти никак нельзя. Анархия? Безвластие? Нам нужен порядок. падает около Исаака

слева Галя дает поднос с кружками

А д о л ь ф. А поэтому — власть беру я! Ну? Кто против? Против нет. Кто за? /Проверяет кто поднял руку/. Против нет. Кто за?

Голосующие замечают: все выходы занимают люди в форме эсэсовцев.

Опустите. Кто за? /Голосующих еще больше/. Кто за? Не опускайте. Кто за? Кто за?

После каждого вопроса все больше рук щетинится и не в голосовании уже, а в приветствии.

Ф и л о с о ф. Но это же насмешка над демократией!

А д о л ь ф. Ты кто? Ты как сюда попал?

А н д ж е л л о. Он интеллигент. Он — философ.

Все — ха-ха после каждой фразы до взять его

А д о л ь ф. А-а мыслитель? Много ест и долго думает. И не просто думает, а приблизительно? Эй, стража! Взять его

Ф и л о с о ф. Вы все — что? Без памяти? Кому вы опять отдаете власть?!

А д о л ь ф. В комфортабельную газовую камеру его! Где стража? Взять его!!

А н д ж е л л о. Всю жизнь молчал. И вот за одну фразу без цензур

мужчины садятся

Философа уводят. И там же его вопль заглушается лязгом железной двери.

идет муз канкан — девушки канканом пошли на авансцену



55

Антонио /из клетки/. ~~Сбейте оковы,~~ Дайте мне волю.

Хиробито. У тебя будет новое начало. Хорошо будет! У тебя все чистое — и прошлое и настоящее. Анджелло! Открой клетку.

Анджелло выпускает из клетки Антонио.

Синьора Фанфани. О, премудрый!

Хиробито. Вот новый документ. Давай старый и... И уходите!

Антонио. Благодарю вас, вождь! Я буду рад, если тебя посадят в клетку! Я буду рад вызволить тебя из клетки!

Синьора Фанфани с внуком торопливо уходят. Гремит гром.

Синьора Фанфани. И не отсекут у тебя язык?!

Хиробито. Почему гром?! Какой гром? Кто позволяет? Где наука. Почему наука не объясняет наших беспорядков. Анджелло! /Появляется Анджелло/. Таскай сюда науку и технику! Иди! /Анджелло уходит/. Какая плохая академия наук! Почему нет объяснений?!

Анджелло. Философа съели, а технократы молчат. Разбаловались!

Еще гром. Перепуганные обитатели подземелья один за другим проскальзывают в приемную вождя.

Голоса. Господи! Спаси и помилуй! Что творится у нас? Что происходит. И никакой информации. И вождь молчит.

Хиробито. Почему молчит? /Орет/. Анджелло! Таскай сюда науку

Анджелло вводит Кейта.

Почему такое безобразие? Почему такой шум? Почему беспорядок? Почему паника? Почему наука не объясняет? А? Я спрашиваю?!!

Кейт. Почему вы так ревете на науку? Орите на своего бога!

Хиробито /удивляется/. Посмотрите, пожалуйста. На него нельзя кричать!.. Они творят, что хотят, безобразия всякие творят, а на них кричать нельзя. Почему гром? Это что? Катаклизм? Землетрясение? Кто должен объяснить? А? Что это?!

Кейт. Это не гром. Это не землятрясение. Это вероятнее всего результат массированных взрывов термоядерных, атомных бомб. Вероятно началась цепная реакция. Вероятно, атом азота не выдержал... Начался распад, разрушение нашей планеты.

Хиробито. Остановите, пока не поздно!

Кейт. Поздно. И криком не остановишь. Не орите. Молиться надо.

Андрэй Макаёнак, трагікамедыя «Дыхайце эканомна». Машынапіс з аўтарскай праўкай. 1982

*Фонд 438, Воп. 1, Спр. 2, арк. 55*



Сцэна са спектакля Акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа «Трыбунал» па п’есе Андрэя Макаёнка, 1970.

*Фонд 262, Воп. 1, Спр. 63, арк. 3*



Андрэй Макаёнак з дачкой.

*Фонд 415, Воп. 1, Спр. 95, арк. 4*



Ірына Ждановіч, Барыс Платонаў і Андрэй Макаёнак.
*Фонд 37, Воп. 1, Спр. 490, арк. 219*



Андрэй Вазнясенскі і Андрэй Макаёнак.
*Фонд 37, Воп. 1, Спр. 490, арк. 218*



Генадзь Аўсяннікаў і Андрэй Макаёнак.
*Фонд 415, Воп. 1, Спр. 95, арк. 1*



Сцэна са спектакля Акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа «Трыбунал» па п’есе Андрэя Макаёнка, 1970.
*Фонд 262, Воп. 1, Спр. 63, арк. 4*



Здзіслаў Стома і Марыя Зінкевіч у сцэне са спектакля «Лявоніха на арбіце», 1980-я.
*Фонд 238, Воп. 1, Спр. 100, арк. 15*




Андрэй Макаёнак на выяздном канцэрце. 1980-я.

*Фонд 238, Воп. 1, Спр. 100, арк. 4*

Віншавальная тэлеграма ад Міхася Лынькова, 1970

*Фонд 191, Воп. 1, Спр. 255, арк. 1*

1

Ф. ТГ-1

В начале телеграммы перед текстом пишется: категория (срочная), особый вид (уведомление телеграфом, вручить лично, ответ., и др.), куда, кому.

| Слов | ПЛАТА | |
|---|---|---|
| | руб. | коп. |
| | | |
| | | |
| Итого | | |

Принял: ______

МИНИСТЕРСТВО СВЯЗИ СССР

# ТЕЛЕГРАММА

Из ______

№ ______

______ сл. ______ го ______ ч. ______ м.

ПЕРЕДАЧА

______ го ______ ч. ______ м.

№ связи ______

Передал ______

Служебн. отметки:

Категория и отметки особого вида:

Куда, кому Мінск Саюз Пісьменнікаў Макаёнку

Дарагі Андрэй Ягоравіч Сардэчна віншую

[illegible]

слаўным ~~пяцідзесяцігоддзем~~ жадаю добрага здароўя

радасці поспехаў

~~новых творчых здабыткаў~~ доўгіх доўгіх год шчаслівага творчага жыцця на славу і веліч народа партыі радзімы Абнімаю цалую

Міхась Лынькоў

Фамилия отправителя и его адрес (в счет слов не входят, не оплачиваются и по телеграфу не передаются).

13/XI 1970.

Белгород, облтипография им. Ленина, 26.I-67 г., з. 601, т. 5000000



Акторы Акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы віншуюць Андрэя Макаёнка з 60-годдзем, 1980. Фатаздымак Уладзіміра Крука. *З фондаў БДАМЛМ.*



Андрэй Макаёнак сярод рэжысёраў самадзейных драматычных тэатраў і драмгурткоў,1978.
Фатаздымак Уладзіміра Крука. *З фондаў БДАМЛМ.*



Індывідуальнае фота А.Я.Макаёнка. 1970.
Фатаздымак Уладзіміра Крука.
*З фондаў БДАМЛМ.*

**«Жыць хочацца. Працаваць хочацца. Буду працаваць. Што ж мне яшчэ застаецца? Вунь колькі гарцуе на сытых конях руціннасці сатырычных персанажаў».**

*Андрэй Макаёнак*
*«Аўтабіяграфія». 1977*